УДК 342.8-05:343.821

*А. А. Кудранок*

# ПРАДАСТАЎЛЕННЕ АКТЫЎНАГА ВЫБАРЧАГА ПРАВА АСОБАМ, ЯКІЯ ЎТРЫМЛІВАЮЦЦА ПАД ВАРТАЙ, МЕХАНІЗМ ЯГО РЭАЛІЗАЦЫІ

*У дадзеным артыкуле разгледжана адно з палітычных правоў грамадзян – права выбіраць і быць выбранымі. Асаблівая ўвага нададзена актыўнаму выбарчаму праву асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, а таксама механізму яго рэалізацыі. Прапануюцца варыянты ўдасканалення заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы выбарчага права, што дазволяць асобам, якія ўтрымліваюцца пад вартай, прымаць удзел у галасаванні.*

Права свабодна выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні – канстытуцыйнае права, якое падрабязна рэгламентуецца ў заканадаўстве, якое рэгулюе адносіны выбарчага права.

Дадзенае права атрымала замацаванне на міжнародным узроўні. У прыватнасці, у частцы 3 артыкула 21 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека 1948 г. [1], а таксама ў артыкуле 25 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах 1966 г. [2]. Дэмакратычныя дзяржавы, у якіх чалавек, яго правы і свабоды з’яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю, прывялі нацыянальнае заканадаўства ў адпаведнасць з міжнароднымі нормамі, замацаваўшы права, якое разглядаецца на канстытуцыйным узроўні.

У Рэспубліцы Беларусь права выбіраць і быць выбранымі, у першую чаргу, замацавана ў Канстытуцыі. Так, артыкул 38 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь вызначае права грамадзян свабодна выбіраць і быць выбранымі ў дзяржаўныя органы на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога або ўскоснага выбарчага права пры тайным галасаванні [3]. Дадзены артыкул замацоўвае асноўныя прынцыпы выбарчага права, якія атрымалі сваё развіццё ў Выбарчым кодэксе Рэспублікі Беларусь.

Асаблівую цікавасць уяўляе прынцып усеагульнасці, згодна з якім у выбарах удзельнічаюць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18 гадоў. Аднак артыкул 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь устанаўлівае, што ў выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. У галасаванні не прымаюць удзелу асобы, у адносінах да якіх у парадку, устаноўленым крымінальна–працэсуальным заканадаўствам, выбрана мера ўстрымання – утрыманне пад вартай.

Лічым, што абмежаванне асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, у актыўным выбарчым праве неабгрунтаванае, бо пакуль асоба ўтрымліваецца пад вартай і ёй не вынесены абвінаваўчы прысуд, які ўступіў у законную сілу, прававы статус грамадзяніна захоўваецца. Па сутнасці, асобы, якія змяшчаюцца пад вартай у чаканні прысуду, з’яўляюцца паўнапраўнымі грамадзянамі, абмежаванымі толькі ў асабістай свабодзе. Такім чынам, можна зрабіць выснову аб некаторай неадпаведнасці палажэнняў артыкула 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прынцыпу прэзумпцыі невінаватасці, замацаванаму ў артыкуле 26 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Да прыкладу, у канстытуцыях большасці краін СНД дадзеная катэгорыя грамадзян валодае правам прымаць удзел у галасаванні (Казахстан (арт. 33), Расійская Федэрацыя (арт. 32), Узбекістан (арт. 117)). Больш за тое, у Канстытуцыі Літоўскай Рэспублікі адсутнічаюць абмежаванні права голасу ў асоб, якія ўтрымліваюцца ў месцах пазбаўлення волі па прыгаворы суда, а не толькі ў асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай (арт. 34) [4].

Такім чынам, прапануем частку 2 артыкула 64 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь выкласці ў наступнай рэдакцыі: «У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі. Любое прамое або ўскоснае абмежаванне выбарчых правоў грамадзян у іншых выпадках з'яўляецца недапушчальным і караецца паводле закона». Таксама прапануем частку 2 артыкула 4 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь выкласці ў наступнай рэдакцыі:
«У выбарах не ўдзельнічаюць грамадзяне, прызнаныя судом недзеяздольнымі, асобы, якія ўтрымліваюцца па прыгавору суда ў месцах пазбаўлення волі».

Больш таго, лічым неабходным артыкул 10 «Правы асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай» Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку і ўмовах утрымання асоб пад вартай» ад 16 чэрвеня 2003 г. № 215–З дапоўніць правам асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, прымаць удзел у галасаванні.

Улічваючы вопыт краін постсавецкай прасторы (Казахстан, Расійская Федэрацыя і інш.) адносна механізму рэалізацыі актыўнага выбарчага права катэгорыі асоб, якія разглядаюцца, адзначым, што ўдзел іх у галасаванні павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. Так, ва ўстаноўленым законам парадку ў месцах утрымання пад вартай павінны быць загадзя сфарміраваны выбарчыя ўчасткі, якія ўваходзяць у выбарчыя акругі. Паколькі ў адпаведнасці з часткай 2 артыкула 17 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь участкі для галасавання ўтвараюцца з улікам не менш за 20 і не больш за 3000 выбаршчыкаў [5], то цалкам абгрунтаваным будзе распаўсюджванне гэтай нормы на выбарчыя ўчасткі, сфарміраваныя ў месцах утрымання пад вартай.

З прычыны гэтага прапануем унесці змены ў частку 3 артыкула 17 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і выкласці яе ў наступнай рэдакцыі:

«Участкі для галасавання могуць быць утвораны ў санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах. Участкі для галасавання ўтвараюцца таксама ў воінскіх часцях, следчых ізалятарах крымінальна–выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, следчых ізалятарах органаў дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (далей, калі не пазначана іншае, – следчыя ізалятары), ізалятарах часовага ўтрымання тэрытарыяльных органаў унутраных спраў, ізалятарах часовага ўтрымання органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь (далей, калі не пазначана іншае, – ізалятары часовага ўтрымання), гаўптвахтах ваенных камендатур, воінскіх часцей унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь (далей – гаўптвахты), а таксама папраўчых установах, арыштных дамах, якія выкарыстоўваюцца ў якасці месцаў утрымання пад вартай».

Таксама ў сувязі з прапанаваным удасканаленнем заканадаўства, неабходна ўнесці змены і ў частку 2 артыкула 50 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і выкласці яе ў наступнай рэдакцыі:

«На ўчастках для галасавання, утвораных у воінскіх часцях, санаторыях, прафілакторыях, дамах адпачынку, бальніцах і іншых арганізацыях аховы здароўя, якія аказваюць медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах, а таксама ў следчых ізалятарах, ізалятарах часовага ўтрымання, гаўптвахтах, папраўчых установах,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

арыштных дамах, якія выкарыстоўваюцца ў якасці месцаў утрымання пад вартай, участковыя камісіі могуць абвясціць галасаванне скончаным і раней 20 гадзін, калі прагаласавалі ўсе выбаршчыкі, удзельнікі рэферэндуму, уключаныя ў спіс».

У выпадках, калі ў месцах утрымання пад вартай колькасць асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, будзе менш за 20, яны будуць унесены ў спіс выбаршчыкаў на бліжэйшым выбарчым участку. У такім выпадку двума членамі ўчастковай выбарчай камісіі або назіральнікамі павінна быць дастаўлена пераносная скрыня для галасавання, якую неабходна будзе ўсталяваць у спецыяльна адведзеным для гэтага месцы, каб забяспечыць тайнае галасаванне. Гэта дазволіць выбаршчыкам, якія знаходзяцца ў месцах утрымання пад вартай, рэалізаваць актыўнае выбарчае права.

Паколькі дакументы, якія пацвярджаюць асобу (напрыклад, пашпарт), у некаторых месцах утрымання пад вартай (напрыклад, у следчых ізалятарах) перадаюцца на захоўванне ў спецыяльны аддзел, то неабходна забяспечыць асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, дакументамі, якія дазволяць ідэнтыфікаваць іх дадзеныя з дадзенымі, названымі ў спісах выбаршчыкаў.

Такім чынам, прааналізаваўшы становішча асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, высветлілі, што ў Рэспубліцы Беларусь, у адрозненне ад заканадаўства асобных краін СНД, дадзеная катэгорыя асоб адносіцца да суб'ектаў, актыўнае выбарчае права якіх абмежавана. З прычыны гэтага лічым, што прадастаўленне асобам, якія ўтрымліваюцца пад вартай, права ўдзельнічаць у галасаванні дазволіць ім рэалізаваць актыўную грамадзянскую пазіцыю і апасродкавана (праз свабодна абраных прадстаўнікоў) паўплываць на палітычнае жыццё грамадства і дзяржавы. У ходзе даследавання прыйшлі да высновы, што для рэалізацыі ў поўнай меры актыўнага выбарчага права названай катэгорыі асоб неабходны дзейсны і наладжаны механізм. Для гэтага патрабуецца ў працэдуры ўдзелу ў галасаванні прадугледзець пэўныя моманты, у першую чаргу, фарміраваць выбарчыя ўчасткі ў месцах утрымання пад вартай у момант правядзення выбараў, уносіць асоб, якія ўтрымліваюцца пад вартай, у спісы выбаршчыкаў на бліжэйшым выбарчым участку і дастаўляць пераносную скрыню для галасавання ў месцы ўтрымання пад вартай у выпадку, калі названых асоб будзе менш за 20, што недастаткова для фарміравання спісаў выбаршчыкаў.

**Літаратура**

1 Всеобщая декларация прав человека [Электронный ресурс] / Организация объединенных наций в Беларуси. – Минск, 2020. – Режим доступа : http://un.by – Дата доступа : 20.04.2020.

2 Международный пакт о гражданских и политических правах [Электронный ресурс] / Организация объединенных наций в Беларуси. – Минск, 2020. – Режим доступа : http://un.by – Дата доступа : 20.04.2020.

3 Конституция Республики Беларусь: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2016. – 64 с.

4 Конституция Литовской Республики: принята гражданами Литовской Республики путем референдума 25 октября 1992 года[Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://worldconstitutions.ru/?p=115. – Дата доступа : 20.04.2020.

5 Избирательный кодекс Республики Беларусь, 11 февраля 2000 г. № 370-З: принят Палатой представителей 24 января 2000 г.: одобр. Советом Респ. 31 января 2000 г. [Электронный ресурс] / Национальный правовой Интернет–портал. – 2020. – Режим доступа : http://www.pravo.by. – Дата доступа : 20.04.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ